*was shown the formation of his personality in the backdrop of social and political processes in Eastern Galicia.*
*Keywords: Vasyl Ilnytskyi priest, historian, populists, Russophile.*

***Алена ФІЛАТАВА, Валянціна ЯНОЎСКАЯ***

# Праваслаўная царква і стараверства заходніх губерніяў у правовой сістэме Расыйскай ымперьи канца XVIII – пачатку XX ст.: гыстрарыяграфыя праблемы

***Олена Філатова, Валентина Яновська***

# Православна церква і старовірство західних губерній у правовій системі Російської імперії кінця XVIII – початку XX ст.: історіографія проблеми

*Проблема зміцнення позицій православної церкви, ставлення уряду до старообрядництва у західних губерніях Російської імперії наприкінці XVIII – на початку XX ст. досить поверхово досліджена. Кінець XX – початок XXI ст. став часом зародження і становлення сучасної школи історичних досліджень з конфесійної історії Росії, України, Литви і Білорусі, в яких на підставі вивчення великої кількості архівних матеріалів появились нові погляди на зазначену проблему.*
*Ключові слова: Російська імперія, західні губернії, православна церква, старообрядництво, духовенство.*

Праблема ў цэлым аб замацаванні пазіцыі праваслаўнай царквы ў заходніх губернях праз удасканальванне прававой сістэмы ў XIX ст. (як у агульнарасійскім, так і рэгіянальным аспекце) у гістарыяграфіі не атрымала належнага адлюстравання. У дасавецкі час некаторыя пытанні распрацоўкі і ажыццяўлення імперскай палітыкі ў дачыненні да праваслаўнай царквы гэтых губерняў былі асветлены ў працах С. Рункевіча, Г. Кіпрыяновіча, А. Мілавідава, М. Ізвекава і інш.[1]. Змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры права-

слаўнай царквы, палітыка адносна праваслаўных манастыроў, далучэнне ўніяцкай царквы да праваслаўнай – гэтыя пытанні сталі прадметам даследавання І. Пакроўскага[2]. Зразумела, што працы дасавецкіх аўтараў канцэптуальна састарэлі. Яны пранізаны духам адданасці царызму, ухваленню яго веравызнаўчай палітыкі. Але іх навуковая каштоўнасць заключаецца ў вялікім эмпірычным матэрыяле.

Гістарыяграфія праблемы заканадаўчага афармлення дзейнасці спецыяльных духоўных навучальных устаноў у дасавецкай гістарыяграфіі прадстаўлена, галоўным чынам, урывачнымі звесткамі ў работах, прысвечаных юбілейным датам асобных устаноў[3]. Яны ўтрымліваюць вялікі фактаграфічны матэрыял па той ці іншай навучальнай установе, але не разглядаюць праблему ў цэлым скрозь прызму ажыццяўлення царкоўных рэформ і іх асаблівасцей на канкрэтнай тэрыторыі. Праблема адраджэння брацкага руху па ініцыятыве ўладаў прадстаўлена ў асноўным артыкуламі, якія змяшчаліся ў “Епархиальных ведомостях”, свецкім перыядычным друку[4] і даволі значнай колькасцю прац, што з’явіліся ў канцы XIX – пачатку XX ст.[5].

Іншыя складнікі праблемы – рэгіянальныя адметнасці ў ажыццяўленні царкоўных рэформ, замацаванне пазіцый праваслаўнай царквы праз духоўную цэнзуру, беларуска-літоўска-ўкраінскія землі ў місіянерскай дзейнасці праваслаўнай царквы – наогул не атрымалі адлюстравання. Шэраг прац прысвечаны фарміраванню духавенства, як асобнага саслоўя. Так, І. Знаменскі прааналізаваў становішча духавенства і тыя змены, што адбываліся ў час праўлення Кацярыны II і Паўла I[6].

Канец XX – пачатак XXI ст. становіцца часам зараджэння і станаўлення сучаснай школы гістарычных даследаванняў па канфесійнай гісторыі Расіі, Украіны, Літвы і Беларусі, у тым ліку і перыяду Расійскай імперыі. І калі для расійскай гістарыяграфіі ў дачыненні да літоўска-беларуска-ўкраінскіх тэрыторый характэрнай рысай застаецца даволі моцны уплыў ранейшых агульнапрынятых палажэнняў, то для беларускай, украінскай і літоўскай – усплеск розных думак і меркаванняў.

Сучасная расійская гістарыяграфія значна пашырыла спектр аналізуемых праблем па гісторыі праваслаўнай царквы канца XVIII – пачатку XX ст., яе ўзаемаадносін з імперскай уладай. Сярод прац вылучаецца кніга І. Смоліча, які паказаў структуру кіравання

праваслаўнай царквой, кірункі яе місіянерскай дзейнасці сярод "инородцев" (да ліку якіх адносіліся і яўрэі). Цікавасць выклікаюць яго разважанні наконт узаемасувязі і паслядоўнасці ажыццяўлення рэлігійных і палітычных задач. Аўтар выказаў слушную думку, што дзяржаўная ўлада разглядала хрысціянізацыю "инородцев" як неабходную ступень для іх наступнай русіфікацыі[7]. Менавіта русіфікацыя, адзначае І. Смоліч, была "сознательной целью государственной политики". Але для дасягнення гэтай мэты неабходна было спачатку перавесці насельніцтва ў праваслаўе. Такім чынам, адзначае ён, русіфікацыя з'яўлялася "естественным следствием перехода в православие, а первостепенной была именно религиозная задача»[8]. Што і вызначала вялізную ролю праваслаўнай царквы ў ажыццяўленні ўнутранай палітыкі дзяржавы.

Адметнасцю і разам з тым адной з ключавых складаючых веравызнаўчай палітыкі ў заходніх губернях Расійскай імперыі, на думку расійскай даследчыцы І. Вібе, было рэгуляванне рэлігійных пераходаў, якое ажыццяўлялася як царкоўнымі, так і свецкімі ўстановамі. Адным з наступстваў паўстання 1830–1831 гг., адзначае яна, была "утрата иллюзий о христианском братстве православных и католиков в силу проявления террора с обеих сторон в ходе восстания и его подавления"[9].

Прававое становішча духавенства Расійскай імперыі, у тым ліку і ў заходніх губернях, адлюстравана ў кнізе "Развитие русского права в первой половине XIX века». Аўтары вылучылі асноўныя кірункі генезісу прававой палітыкі ўраду ў адносінах да духавенства, засяродзілі ўвагу на ўзмацненні карных функцый Св. Сінода да іншаверцаў, паказалі развіццё духоўнай цэнзуры ў першай палове XIX ст.[10]. Б. Міронаў, разглядаючы заканадаўчае афармленне духавенства як саслоўя ў Расійскай імперыі, прыйшоў да "парадаксальнага", на яго погляд, заключэння, што ў межах усёй дзяржаўнай сістэмы духавенства як саслоўе карысталася самакіраваннем[11].

Даволі распаўсюджанай у апошнія гады ў гістарыяграфіі стала тэма рэформаў Расійскай імперыі, або так званых "Вялікіх рэформаў"[12], адпаведнае месца сярод якіх займалі царкоўныя рэформы і ў больш шырокім аспекце – узаемаадносіны царквы і дзяржавы[13]. Аналізуючы між іншым дзяржаўную палітыку ў адносінах да праваслаўнай царквы ў цэлым, работы гэтыя, як правіла, не адлюстроўваюць спецыфіку яе ў заходніх губернях.

Вядома, што пасля паўстання 1863–1864 гг. тут быў уведзены рэжым выключных законаў, які ў канфесійных адносінах тычыўся галоўным чынам рыма-каталіцкай царквы. У дачыненні да праваслаўнай, як слушна адзначыў беларускі даследчык А. Бендзін, новы палітычны курс ставіў на мэце з дапамогай надзвычайных мер “восстановить в крае законность и правопорядок и, прежде всего, в той сфере, которая относилась к защите прав и привилегий господствующей Православной церкви»[14]. Праўда, правы і прывілеі тычыліся, галоўным чынам, этна-канфесійных адносін. У дачыненні да выпрацоўкі палітычнага курса самаўладдзя Св. Сінод не разглядаўся ў другой палове XIX ст. у якасці органа актыўнай адміністрацыі. “Представители духовенства, – адзначыла расійская даследчыца С. Аляксеева, – принимали участие в работе Комитета и Совета министров эпизодически, на волне реформаторских настроений 1860-х гг., по делам раскола и в связи с созданием Главного Присутствия по делам об улучшении быта православного белого духовенства”[15].

Новы аспект – канфесійны бок імперскага ўпраўлення і ягоныя праяўленні ў розных рэгіёнах імперыі – дэманструе кніга амерыканскага гісторыка П. Верта. У гэтай працы цікавай нам падаецца думка аўтара аб тым, што адносна праваслаўных Украіны і Беларусі ў гістарыяграфіі нярэдка працягвае дамінаваць афіцыйная пазіцыя імперскіх уладаў, згодна з якой праваслаўныя гэтай тэрыторыі лічыліся рускімі, а моўныя і гістарычныя асаблівасці насельніцтва не ўлічваюцца[16]. На адметнасць праваслаўных святароў беларуска-літоўскіх губерняў ад вялікарускіх звяртае ўвагу расійскі даследчык М. Далбілаў, які сцвярджае, што пасля паўстання 1863–1864 гг., калі ў край было накіравана шмат служачых з “Великороссии”, сутычкі паміж чыноўнікамі і праваслаўнымі святарамі ўзмацніліся”[17].

На пачатку 1990-х гадоў актывізавалася вывучэнне канфесійнай гісторыі беларускімі гісторыкамі. Новы этап даследавання канфесійнай гісторыі Беларусі адкрыла перавыданне прац вядомага гісторыка М. Нікольскага і архіепіскапа Афанасія Мартаса[18]. Важным крокам на шляху навуковай распрацоўкі гісторыі канфесій стала першая абагульняючая калектыўная манаграфія “Канфесіі на Беларусі”[19]. У манаграфіі аналізуецца лёс усіх канфесій, у тым ліку і праваслаўнай, на працягу даволі вялікага гістарычнага адрэзку часу – больш двух стагоддзяў. Вялізны масіў архіўнага матэрыялу, які да гэтага часу доўгія гады праляжаў незапатрабаваным у

архівасховішчах Мінска, Вільнюса, Санкт-Пецярбурга, быў упершыню ўведзены ў навуковы зварот. У 2002 г. выйшла манаграфія В. Яноўскай[20], у 2006 г. – А. Філатавай[21].

Значна актывізавалася даследчыцкая і выдавецкая дзейнасць Беларускай праваслаўнай царквы Маскоўскага патрыярхату. Навуковыя артыкулы гістарычнага характару друкуюцца ў "Трудах Минской Духовной Академии", аднавіліся "Епархиальные ведомости". Кніжную прадукцыю выдаюць два праваслаўныя брацтвы (Трох Віленскіх пакутнікаў і ў імя Архістраціга Міхаіла), выдавецтвы пры манастырах, Беларускім Экзархаце, шэраг прыватных. Ёсць сярод іх і гістарычныя працы, і кнігі даведачнага характару. Вынікам супрацоўніцтва свецкіх гісторыкаў (у першую чаргу БДУ) з царкоўнымі праваслаўнымі гісторыкамі стала перавыданне кнігі В. Бяднова, што доўгі час была практычна невядомай для гістарыяграфіі[22].

Спектр пытанняў, што ставіўся ў другой палове XIX ст. перад брацтвамі, іх ідэалагічная скіраванасць ва ўмовах будаўніцтва "вялікай рускай нацыі" прадвызначаюць актуальнасць дадзенай праблемы для сучаснай беларускай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіі. Кандыдацкія дысертацыі, артыкулы па гісторыі асобных брацтваў, або брацкага руху ў межах адной епархіі/губерні, што пачынаюць з'яўляцца ў сучаснай гістарыяграфіі[23], даюць магчымасць аналізаваць праблему ў гістарычным развіцці і даволі ўсебакова.

Гістарыяграфія стараверства дасавецкага часу, што тычылася XIX – пачатку XX ст., зусім бедная. Яна складаецца галоўным чынам з асобных артыкулаў, што выдаваліся на працягу XIX ст. ў епархіяльных ведамасцях[24], а таксама работамі, што выйшлі на пачатку XX ст.[25]. Сучасная расійская гістарыяграфія ўтрымлівае новыя падыходы даследавання веравызнаўчай палітыкі ў дачыненні да старавераў на агульнарасійскім узроўні[26]. І хаця гэтыя работы, як правіла, не маюць звестак па заходніх губернях, яны даюць магчымасць даследчыкам выявіць спецыфічныя рысы, уласцівыя гэтай тэрыторыі, і паглыбіць рэгіянальны аспект даследавання праблемы.

Піянерамі сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў даследаванні гісторыі і сучаснага стану ў Беларусі стараверства можна лічыць супрацоўнікаў інстытута філасофіі і права НАН Беларусі, якія ў 1992 г. апублікавалі кнігу "Старообрядчество в Беларуси"[27]. Зразумела,

што ў адной невялікай па аб'ёму публікацыі немагчыма было грунтоўна даследаваць увесь комплекс пытанняў, звязаны з гісторыяй і сучасным станам стараверства ў Беларусі. Але іх праца стала важным штуршком для разгортвання далейшых даследаванняў. Вядучым даследчыкам гэтай праблемы ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі, бясспрэчна, з'яўляецца А. Гарбацкі. Яго манаграфіі[28] грунтуюцца не толькі на вялізным архіўным матэрыяле (з архівасховішчаў Масквы, С-Пецярбурга, Мінска, Гродна), але і этнаграфічных экспедыцыях, якія ён сам ажыццявіў. Праўда, не ўсе ягоныя канцэптуальныя падыходы да даследавання праблемы раздзяляюць канфесійныя гісторыкі. Як сцвярджае даследчыца канфесійнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі А. Філатава, "в работе сохранился традиционный православный взгляд на старообрядчество, как бы оставляя в тени своеобразие белорусской территории"[29].

Такім чынам, можна адзначыць, што праблема замацавання пазіцыі праваслаўнай царквы, адносіны ўраду да старавераў ў заходных губернях Расійскай імперыі канца XVIII – пачатку XX ст. праз удасканальванне прававой сістэмы доўгі час не атрымлівала належнага адлюстравання ў гістарыяграфіі. Канец XX – пачатак XXI ст. стаў часам зараджэння і станаўлення сучаснай школы гістарычных даследаванняў па канфесійнай гісторыі Расіі, Украіны, Літвы і Беларусі, у якіх на падставе вывучэння вялікай колькасці архіўных матэрыялаў з'явіліся новыя погляды на вызначаную праблему.

[1] Рункевич С. История Минской архиепископии (1793–1832 гг.) / С. Рункевич – СПб.: тип. А. Катанского, 1893; Киприанович Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего до нашего времени / Г. Я. Киприанович. – Вильна: тип. И. Блюмовича, 1895; Миловидов А. Н. Заслуги графа М. Н. Муравьёва для православной церкви в Северо-Западном крае / А. Н. Миловидов. – Харьков: тип. губернского правления, 1900; Извеков Н. Д. Исторический очерк состояния Православной Церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 г. / Н. Д. Извеков. – М.: печатня А. И. Снегирева, 1899.

[2] Покровский И. М. Русские епархии в XVI–XIX вв., их открытие, состав и пределы / И. М. Покровский. – Т. 2. – Казань, 1913.

[3] Глыбовский Ф. Г. Пережитое и перечувствованное в Пинском духовном училище Минской губернии (1865–1868) / Ф. Г. Глыбовский. – Брест-Литовск, 1899; Довгялло Д. И. Витебская духовная семинария (1806–1906): заметки и воспоминания / Д. И. Довгялло. – Витебск: тип. насл. М. Б. Неймана, 1907; Столетие существования Могилёвской духовной семинарии. 1785–1885. – Могилёв: тип. губернского правления, 1885;

Столетний юбилей Минской духовной семинарии. – Минск: тип. губернского правления, 1894; Шелепин Н., Могилёвское женское училище духовного ведомства (1863–1913 гг.) / Н. Шелепин, Н. Гомолко. – Могилёв: тип. губернского правления, 1914; Щеглов И. К. К столетию Витебского духовного училища. 1810–1910 / И. К. Щеглов. – Витебск: тип. губернского правления, 1911.

[4] Коялович М. О. Новые взгляды на православные западно-русские братства / М. О. Коялович // Церковный вестник. – 1875. – № 40; Коялович М. О. Сведения о современном состоянии западно-русских братств / М. О. Коялович // День. – 1862. – № 44, 45.

[5] Миловидов А. И. Западнорусские православные братства, их современное значение и задачи / А. И. Миловидов. – Вильна: тип. "Русский почин", 1912; Труды съезда представителей западнорусских православных братств, состоявшегося в Минске 29–31 августа 1907 г. – Минск: тип. С. А. Некрасова, 1908; Труды съезда представителей западнорусских православных братств, состоявшегося в городе Вильне по инициативе Виленского Свято-Духовского братства 2–5 августа 1909 года. – Вильна: тип. "Русский почин", 1909; Папков А. А. Братства. Очерк истории западно-русских православных братств / А. А. Папков. – СПб., 1900; Довгялло Д. И. Витебское братство Св. равно-апостольного князя Владимира и отношение к нему общества / Д. И. Довгялло. – Витебск: тип. Губернского правления, 1897; Паевский А. Р. Историческая судьба и значение западнорусских братств / А. Р. Паевский. – Гродно: тип. губернского правления, 1897.

[6] Знаменский И. Положение духовенства в царствование Екатерины II и Павла I / И. Знаменский. – М.: тип. М. Н. Лаврова, 1886.

[7] История русской церкви. – Кн. 8. – Ч. 2. – М.: изд-во Спасо-Преобр. Валаам. мон., 1997. – С. 207.

[8] История русской церкви. – Кн. 8. – Ч. 2. – М.: изд-во Спасо-Преобр. Валаам. мон., 1997. – С. 201.

[9] Вибе И. Н. Вероисповедная политика самодержавия в Западном крае: 1830–1855: автореф. дисс. ...канд. ист. наук / И. Н. Вибе. – СПб., 2009. – С. 3.

[10] Развитие русского права в первой половине XIX века. – М.: Наука, 1994. – С. 61, 64.

[11] Миронов Б. Н. Социальная история России / Б. Н. Миронов. – Т. 1. – СПб.: «Дмитрий Буланин», 1999. – С. 103.

[12] Комзолова А. А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М.: Наука, 2005.

[13] Алексеева С. И. Святейший Синод в системе высших и центральных государственных учреждений пореформенной России. 1856–1904 гг. / С. И. Алексеева. – СПб.: Наука, 2003; Гавриленков А. Ф. Политика власти Российской империи в отношении Православной церкви, инославных конфессий и авраамических (нехристианских) вероисповеданий в 1721–1917 гг.: периодизация, сущность и принципы, эволюция / А. Ф. Гавриленко. – М.: Моск. гос. обл. университет, 2010; Фирсов С.Л. Русская церковь накануне перемен (конец 1890-х – 1918 гг.) / С. Л. Фирсов. – М.: Культурный центр «Духовная библиотека», 2002; Николин А. Церковь и

государство (история правовых отношений) / А. Николин. – М.: Сретенский монастырь, 1997; Фёдоров В. А. Русская православная церковь и государство: синодальный период (1700–1917) / В. А. Федоров. – М.: Русская панорама, 2003.

[14] Бендин А. Ю. Религиозно-этнические противоречия и конфликты на территории Северо-Западного края Российской империи (вторая половина XIX – начало XX вв.) // Русский сборник: Исследования по истории России. T.VIII. – М.: изд. Модест Колеров, 2010. – С. 64.

[15] Алексеева С. И. Святейший Синод в системе высших и центральных государственных учреждений пореформенной России. 1856–1904 гг. / С. И. Алексеева – СПб.: Наука, 2003. – С. 157.

[16] Верт Пол. Православие, инославие, иноверие: очерки по истории религиозного разнообразия Российской империи / П. Верт. – М.: Новое литературное обозрение, 2012. – С. 6.

[17] Долбилов М. Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов. – М.: Новое литературное обозрение, 2010. – С. 81.

[18] Никольский М. Н. История русской церкви / М.Н. Никольский. – Минск: Беларусь, 1990; Мартос А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. – Минск: Белорусский Экзархат Русской Православной церкви, 1990.

[19] Грыгор'ева В. Канфесіі на Беларусі / В. Грыгор'ева, У. Завальнюк, У. Навіцкі, А. Філатава. – Мінск: Экаперспектыва, 1998.

[20] Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863–1914 гг. / В. В. Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002.

[21] Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. / Е. Н. Филатова. – Минск: Белорусская наука, 2006.– С. 19.

[22] Беднов. В. А. Православная церковь в Польше и Литве (по Volumina Legum) / В.А. Беднов. – Минск: Лучи Софии, 2002.

[23] Гажва И. А. Религиозно-просветительская деятельность православных братств Центральной России во второй половине XIX – начале XX вв.: на материалах Владимирской и Костромской губернии: дисс. ... канд. ист. наук / И. А. Гажва. – Иваново, 2008; Восович С. М. Православные братства Полоцкой епархии в 1861–1914 гг. / С. М. Восович // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2009. – № 6. – С. 34–38.

[24] См.: Литовские епархиальные ведомости за 1870, 1876, 1883, 1896 гг.

[25] Горючко П. С. Материалы для истории раскола старообрядчества в Могилевской губернии конца XVIII и начала XIX столетий / П. С. Горючко. – Могилев: тип. губернского правления, 1902; Пругавин А. С. Старообрядчество во второй половине XIX века: очерки из новейшей истории раскола / А. С. Пругавин. – М.: тип. И. Д. Сытина, 1904.

[26] Шахов М. О. Старообрядчество, общество, государство / М. О. Шахов. – М., 1998; Шахов М. О. Старообрядческое мировоззрение: религиозно-философские основы и социальная позиция / М. О. Шахов. – М.: РАГС, 2001; Ершова О. П. Старообрядчество и власть / О. П. Ершова. – М.: Наука, 1999; Ершова О. П. Старообрядчество и государственная политика в

России в области вероисповедания во второй половине XIX – начале XX веков: автореф. дисс. ... докт. ист. наук / О. П. Ершова. – М., 2000; Мошковцева В. В. Конфессиональная политика государства по отношению к старообрядцам во второй половине XIX – начале XX века (на материалах Вятской губернии): автореф. дисс. ... канд. ист. наук / В. В. Мошковцева. – Ижевск, 2002.

[27] Короткая Т. П. Старообрядчество в Беларуси / Т. П. Короткая, Е.С. Прокошина, А. А. Чудникова. – Минск: Навука і тэхніка, 1992.

[28] Гарбацкі А. А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.ст. / А. А. Гарбацкі. – Брэст: Бр.ДУ, 1999; Горбацкий А. А. Старообрядчество на белорусских землях / А. А. Горбацкий. – Брест: БрГУ, 2004.

[29] Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. / Е. Н. Филатова. – Минск: Белорусская наука, 2006. – С. 11.

**_SUMMARY_**

**_Alena Filatava, Valiantsina Yanouskaya_**

**_Legislative framework for Orthodox Church and Old Belief of western provinces of Russian Empire in the end of 18th – beginning of 20th centuries; a historiography of the problem_**

*The issues of strengthening the Orthodox Church position, of Russian Empire authorities attitude to old believers in imperial western provinces in the late 18th – early 20th centuries have not been studied thoroughly yet. At the threshold of the 21st century contemporary religion studies school took its shape in Russian, Ukrainian, Lithuanian and Belarusian historiographies. The scholars, belonging to this school, base their studies on a large number of archival materials and propose novel views and interpretations of the subject matter.*

*Key words: Russian Empire, western provinces, Orthodox Church, Old Belief, clergy.*

**_Віталій ТЕЛЬВАК, Василь ПЕДИЧ, Вікторія ТЕЛЬВАК_**

# «З історії релігійної думки на Україні» Михайла Грушевського в оцінках сучасників

*Досліджується проблема рецепції праці Михайла Грушевського «З історії релігійної думки на Україні» в історіографії першої третини XX ст. Проаналізовані критичні відгуки західноукраїнських, емігрантських та радянських суспільствознавців. Зроблено висновок про значну заполітизованість тогочасного грушевськознавчого дискурсу.*

*Ключові слова: Михайло Грушевський, «З історії релігійної думки на Україні», історіографія, рецензія, дискусія.*